**Заданні**
**школьнай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры**

**7 клас**

**Заданне 1. Укажыце колькасць указаных гукаў у прапанаваных сказах.**
1) **[а]:** Без галавы, што без рук.
2) **[й]:** Людзі і сякерай голяцца, а мы і брытвай не ўмеем.
3) **[д]:** Калі дзед – ёсць і абед, няма дзеда – няма і абеда.
4) **[с]:** Не скачы на высокія горы, бо на нізкія сядзеш.

*(4 б. – 1 бал за кожны правільны адказ)*

**Заданне 2. Пазначце, у якіх раздзелах навукі пра мову вывучаюцца наступныя словы:**
*гук, марфема, словазлучэнне, сказ.*

*(4 б. – 1 бал за кожны правільны адказ)*

**Заданне 3. Дапішыце беларускія прыказкі.**
1) З песні... .
2) ... не таварыш.
3) ... кашы не сапсуеш.

*(3 б. – 1 бал за кожны правільны адказ)*

**Заданне 4. Вызначце спосаб утварэння наступных слоў.**
1) Адгалосак, 2) бель, 3) веславаць, 4) дружбак, 5) невысокі, 6) па-беларуску, 7) светлавалосы, 8) чубаты.

*(8 б. – 1 бал за кожны правільны адказ)*

**Заданне 5. Некаторыя паняцці ў рускай мове падаюцца праз словазлучэнні, якія ў беларускай мове абазначаюцца адным словам. Зрабіце пераклад.**
Вопросительный знак – …, берёзовый сок – …, печная труба – …, белый гриб – …, восклицательный знак – …, летучая мышь – …, носовой платок – …, тёплые края – … .

*(8 б. – 1 бал за кожны правільны адказ)*

**Заданне 6. Са слоў, якія знаходзяцца ў дужках, выберыце патрэбнае, каб утварыць словазлучэнне, запішыце.**
1) Гартаць (сена, зямлю, часопісы); 2) варочаць (горы, сена, сшыткі); 3) адчыніць (школу, сход, дзверы); 4) адкрыць (канферэнцыю, кнігу, акно); 5) статак (акунёў, сабак, кароў); 6) чарада (людзей, гусей, ваўкоў); 7) табун (тараканаў, курэй, коней); 8) касяк (дарослых, акунёў, грыбоў); 9) гайня (сабак, птушак, змей); 10) неруш (грыбоў, пісьменнікаў, гарадоў).

*(10 б. – 1 бал за кожны правільны адказ)*

**Заданне 7. Пастаўце назоўнікі ў форме меснага склону адзіночнага ліку.**
Лес, агарод, Рыгор, луг, суддзя, конь, Пецярбург, герой, стог, паверх, лопух, тварог.

*(12 б. – 1 бал за кожны правільны адказ)*

**Заданне 8. Устаўце ў фразеалагізмы прапушчаныя кампаненты-лічэбнікі ў патрэбнай склонавай форме. Запішыце.**
1) Іграць … скрыпку;
2) за … пячаткамі;
3) да … поту;
4) палка з … канцамі;
5) адным стрэлам забіць … зайцаў;
6) у … сценах (сядзець, жыць).

*(6 б. – 1 бал за кожны правільны адказ)*

**Заданне 9. Вызначце выяўленчыя сродкі мовы. Узор:** эпітэт – горкая доля.

Уюцца змейкай срабрыстай дарожкі,
Брызгі золата ў небе блішчаць,
І маркотныя месяца рожкі
Праз марозную мглу зіхацяць.

М. Багдановіч. Зімовая дарога

*(6 б. – 1 бал за кожны правільны адказ)*

**Заданне 10. Пададзены прозвішчы беларускіх пісьменнікаў, замест пропускаў запішыце іх імёны.**
**…** Багдановіч, …Барадулін, … Броўка, … Быкаў, … Гілевіч, … Караткевіч, … Танк.

*(7 б. – 1 бал за кожны правільны адказ)*